**КАСТУСЬ ЦВІРКА**

# КАЛАСЫ

вершы

Мінск
МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА
1975

# Я з той краіны…

## **Я з той краіны…**

Я з той краіны, дзе рвуцца з долу
Тугія стрэлы хвой карабельных,
Дзе, белагрудыя, над вадою
Стаяць бярозы, як каралевы.

Там пушчы — заблудзішся.
Толькі па зорах.
Па сцежках зубрыных знойдзеш дарогу.
У рэках сонных, у цёплых азёрах
Там ходзяць і сёння акунь ды стронга.

Я з той краіны, дзе ўранні жанчыны
Браць лён ідуць як адна, хаўрусам.
Глядзі ды любуйся: воч золак сіні
Ды рэчкай з-пад хуст —
валасы бела-русыя.

А хлопцы там — сокалы.
Дзень у хлопцаў —
На зрубах звонкіх, на дрогкіх машынах,
А вечар — над ручкі вядуць да варотцаў
Пявучых сяброваk сваіх з вечарынак.
Я з той краіны, што ў век беспрасветны
Ясны прамень нарадзіла — Скарыну
І песню для славы дала сусветнай
Адаму Міцкевічу — роднаму сыну.

З краіны, дзе Каліноўскага слова

Лес віл ды кос на цара ўздымала,
Дзе голасам чыстым у час суровы
Зваў з цемры люд свой Янка Купала.

Я з той краіны, што мужна сустрэла
Браню прышэльца ў дні грозныя тыя,
Што ўся — ад неба да неба — гарэла,
Як свечка, тысячаю Хатыняў.

Там месца нідзе не знаходзілі каты
Ад куль партызанскіх і ад гранатаў,
Былі ў партызанах там дрэвы і хаты,
Была ў партызанах сама зямля там.

Я з той краіны, што кранаў рукамі
Узнесла з руін гарады, як вясёлкі,
Што гуслямі новымі — правадамі
Абвесіла ўсе бальшакі і прасёлкі.

Разносяць па свеце краіны той славу
Асілкі-БелАЗы — шырокі канвеер!
Краіны той голас высокі па праву
Гучыць паміж роўных на ўсіх асамблеях!

Я з той краіны, дзе ліпень купае
Зару ўсю ноч у ставах птушыных
І дзе стагоддзі агнёў купалля,
Чырванакрылых, не патушылі,

Дзе песню новую да небакраю
Нясе маладосць па шляхах вясновых
І плешча мора — вечна жывая,
Мая беларуская звонкая мова!

* * *

Мае землякі —
людзі не гаваркія.
Здаўна пра іх кажуць:
на словы скупыя.
Ды мне яны
шмат пра сябе гавораць
Сваімі жытамі,
якім не ўстаіцца ніяк ля небасхілаў Асінава
(каласоў шматгаловае веча!);
Волатамі-стагамі,
што да вясны наваколле духмяняць
(сабралі ў іх косы ўвесь луг казяльцовы!):
Слуцкімі бэрамі срэбралістымі,
дзе сонца збірае мёд
у пладоў яснабокіх скарбонкі;
Дамамі з узорнымі ліштвамі,
дзе, вылецеўшы з-пад разца гаспадара,
паселі навечна — дзюба да дзюбы —
галубоў неразлучныя пары.
Расказваюць мне землякі
пра сябе красамоўна
Вяргінямі ды півонямі,
што ўсё лета гараць пад вакном
на высокіх сцяблінах (што паходні!);
Ахапкамі маю,
якім харошаць на свята ганкі і вуліцы
(пахне ўся вёска тады бярозкамі ды аерам).
Пра сябе землякі
мне вельмі шмат гавораць
Нават тады, як маўчаць,
Ідучы, прыгорбіўшы плечы,
За труною свайго вяскоўца,
З якім увесь век аралі і сеялі,
Гулялі ўлазіны і вяселлі,
Спявалі і плакалі...

## Маім землякам

Пеў ранак.
Ліп прывулічных сям'я
Паціху ліст пад ногі церушыла.
Птах пакідаў гняздо.
Быў гэтым птахам я.
Пара, пара:
цягнулі ў вырай крылы!
Былі са мной
усе мае гады,
Якія тут, па ржэўніку ды стружках,
Прабеглі па чарзе
і назаўжды
Застылі ў сцежках,
нібы ў кінастужках.
Краці —
і загайдаюцца ў двары
Арэлі ў памяці, як на экране,
Ад нашых пятак
жарабкі з гары
Рвануцца —
не ўтрымаеш на аркане...
Ды не пра гэта думалася мне.
Калі далей ад нашай хаты крочыў,
Усё выразней чуў я на спіне
Задуманыя
мацерыны вочы.

. . . . . . . . . . .

Згарала ноч на свеце без пары,
І сон дашчэнту кулямёты рвалі.
Віселі скрозь
пажараў ліхтары,
І кулі
калыханкі нам спявалі.

Мы ў вёсачцы — балотным астраўку,—
Нібы зайцы загнаныя,
сядзелі.
Між іскраў,
сполахаў,
між гэтых куль
Жылі пад зорамі
адной надзеяй.

Ішла вясна тым часам з балатоў,
Усё да зерня вымеўшы з каморкі.
Было ж у маці —
нашых пяць ратоў,
Якім
так абяцанкі ўсе агорклі!

Адна ў пас мара шчырая была:
Знайсці б дзе хлеба чэрстваго —
хоць трошкі.
Малыя пальчыкі з пазоў стала
Даўно павыкалупліваλі крошкі.

На ўслоне дзежка, што карміла нас,
Даўно ўжо закарэла, нібы камень,
І мы дарэмна — у каторы раз! —
Глядзелі ў печ
                    галоднымі вачамі.

Усё немец выбраў — яйка, млека, шпэк,
Усё выграб прагавітай пяцярнёю.
Як у сваё, ён лазіў у засек,
Пакінуўшы нам
                    сцены з парахнёю.

За тое, што усё ж вясной крутой
Мы не папухлі,
                    дзякуй табе, шчаўе!
Уратавала нас
                    ты з «пышкай» той,
Што ў полі мы знаходзілі,
                                    як шчасце!

І вось
      (якраз у шчаўі мы былі)
Данёс «ура!»
                    нам вецер да балотца.
О як мы беглі —
                    па раллі, галлі —
Да зорачкі,
                    што ззяла на пілотцы!

Мы аж не верылі,
                                    што ўжо і след
Прастыў той немчуры
                                    і што шырока
Перад вачамі расхінула свет
Маленечкая зорачка
                                    навокал.

А скрозь яшчэ гарэнілі дымы,
На печышчах садзіліся вароны.
І доўга выздараўлівалі мы
Ад той вайны —
                              жахлівейшай хваробы.
Хоць зарабляла маці працадні,
Хоць на жніве да вечара пацела.
Ды толькі замест хлеба
                                    дзень пры дні
Нам палачкі насіла
                                    на паперы.

Мы тыя палачкі
                              і так, і сяк
Круцілі
          і, хоць ад бясхлеб'я млелі,
Ды што не прыдумлялі,
                                    аніяк
Іх, выбачайце,
                              есці ўсё ж не ўмелі.
Шукалі мы па ржышчы каласка,
Альбо,
     сабраўшы малачаю горку,

Зноў — кожны дзень — чакалі малака
Ад цёлкі,
што падбрыквала ў падворку.

Зноў суцяшала маці нас дарма
І ўсё, што здабывала дзе знячэўку,
Заўжды нам аддавала,
а сама
Хадзіла так —
аж высахла ўся ў шчэпку.

І вось у хмарах заяснела сінь,
Ад дум не спала маці:
ёй у горы
Нарэшце помач будзе —
большы сын
Сягоння едзе па навуку ў горад.

. . . . . . . . . . .
З пафарбаванай торбай за спіной,
У новых зрэбных портках пакачаных
Ішоў я нашай вулкай травяной
Ад гэтых нізкіх хат
у свет нязнаны.

Глядзелі ўслед мне стрэхі і платы,
Глядзелі моўчкі
нашай хаты вокны
(Як сёння, бачу там я збан пусты),
Глядзелі,
як самой надзеі вочы.
Шаптаў я клятву шчырую сабе
Надзею маткі спраўдзіць
і прывезці
Ёй са стыпендыі які рубель —
Хоць раз як след сястрычкам бы пад'есці.

Я кляўся й вам аддзячыць, землякі,
За вашу — хай зусім скупую — помач,
За тое,
што заўсёды ў час цяжкі
Былі вы —
са сваёй спагадай —
побач.
Асіраціла многіх нас вайна.
Я помню твар суседскае дзяўчынкі,
Што нават быў блядней ад палатна,
І ручкі яе —
нібы чарацінкі...
. . . . . . . . . . .

Прамчала ў зоры чарада гадоў,
Знайшоў я хлеб, займеў імя паэта,
Ды толькі мой, з маленства ўзяты, доўг
Застаўся неаплочаным
дагэтуль.

Ён сёння нават большы, як калі.
Усім, што ёсць,
і ўсім, што яшчэ будзе,

Я абавязан маці і зямлі
І вам, вяскоўцы,—
вечнай працы людзі.

Нібы з зямлі, вы ў гэты свет ішлі,
І — у сваёй глушэчы —
толькі й зналі,
Што рвалі пні,
уходжвалі палі,
Аралі,
сеялі,
палолі,
жалі.
Не бачылі вы й свету прад сабой:
Еў пот вам вочы,
пёк сляпень ахвоча,
Ды ў поле зноў ішлі —
з кляцьбой, з мальбой —
Ад веку ў век,
ад ночы і да ночы.

Вас, ціхіх, вас, даверлівых, сляпых,
Заўсёды толькі ёрмы і чакалі,
Шмат ездзіў хто па вас — цярпі, цярпі! —
І ўсюды пасвіў вас бізун
вякамі.
Вы моўчкі неслі сваю скаргу ў дол —
Мой край,
ты быў, як камень, безгалосы.
Скрыпелі толькі сохі навакол,
Званілі толькі ў балацінах косы.

Ступіў цяпер век іншы да сяла —
Даўно струхнелі сохі,
і прасторы
Ад краю і да краю заняла
Сягоння песня новая —
матары.

Ёсць хлеб у вас — яго вам даў не бог!
Ды жывяце вы ўжо
не толькі хлебам.
Вам трэба песня,
шырыня дарог
Ды вольнае, без бамбавозаў неба...
Да вас, ледзь хваля вольная,
бягуць
Мае сцяжыны —
жытам, верасамі.
Як хараша ізноў тут сэрцам чуць
Мне вашу мову —
простую, як самі.

Прысяду каля цётак і дзядзькоў —
Пальецца рэчкай вольнаю гаворка.
Усё, што на душы ў землякоў,
Вазьму да сэрца —
горка ці не горка.
І тое, што ў Падзерах паплавы
Ўзараны «Сельгастэхнікай» не ўзорна,

І што ад хіміі,
замест травы,
Пчол гіне цьма —
«унь ля вуллёў аж чорна»,
Я слова кожнае злавіць спяшу,
Каб знаць, вяскоўцы, клопат ваш і жыцце.
Той клопат — ён і мой,
і я прашу:
Кажыце мне пра ўсё, як ёсць,
кажыце.
Запомню ўсё, нічога не міну:
Праслаўлю дзень наш — сонечную
птушку,
А раўнадушша, подласць і ману
Вазьму я на пяро,
нібы на мушку.

Для праўды чыстай, што без пазалот,
Я адчыню ў радках шырока дзверы.
Адно мне трэба:
думак вашых лёт
Адбіць, як ёсць, вяскоўцы,
на паперы.
Любое мае слова, кожны зык —
Усё ад вас
і ў вашу абарону.
Я — гэта ваша мова, ваш язык,
Нягучны хай,
ды верны вам
да скону.

## Першы крык

Ау, айкумена![1]
Каметай
рассек я сцяну нематы.
Ад бабчыных пальцаў вось гэтых
і да нябёс яснаты —
ярасны крык.
Гэта —
продкаў
спрасованыя галасы.
Ау, айкумена!
Глотка
мая перапоўнена
(«Сын!»).
За вокнамі — ходзяць вёдры...
Рыпяць па сяле жураўлі...
І дзядзька ў белай кашулі
(ён вёз паўз платы канюшыну з Альхоўкі)
каня ля вакна прыпыніў...
Я -
з самага ціхага краю
(замарудзілі й рэкі там бег).
Ау, айкумена!
Гукаю
галасамі радзімы табе!

[1] А й к у ме н а — населеная частка Зямлі.

* * *

За Стоўбцамі, дзе, як паданне, ноч,
Каціў мне Неман серабро да ног.
У яснай, як пяць пальцаў, глыбіні
Тапіў ён, не хаваючы ані,
Змяю, Пегаса, Рыб, Вялікі Воз
І пастуха двурогага нябёс.
Якая прыгажосць!
Ды ў дзіўнай той цішы
Чагосьці не хапала ўсё ж душы...
Раптоўна збоку, там, дзе белы плёс,—
Як нож у ноч, застылай хвалі ўсплёск!
Ды гэта ж, ледзь ні побач, паўз кусты
Ішлі, гнучыся у дугу, плыты —
Па Млечным Шляху, па маладзіку,
Па неба скінутага цаліку!
Агонь паблісквaў па плытах. Пры ім
Стаяў хлапец з цыгаркаю і пхаў
У бераг жэрдкай; дзядзька на спіне
Ляжаў і хроп — між зор відаць быў нос!
І сэрца тут мае, якое штось гняло,
Устрапянулася у момант, ажыло.
Я зразумеў, прырэчных плёсаў госць:
Найлепшы той пейзаж, дзе людзі ёсць!

**Даяркі**

Пад восеньскім сонцам няяркім,
Чакаючы пастухоў,
Усмешлівыя даяркі
Пляткараць пра жаніхоў.

Ці ж дома ўседзець дзяўчатам —
Стаяць пад вецярком.
Як малако, халаты
І шчокі — кроў з малаком!

Даяркам — мілым, прывабным,
Не трэба чужога святла:
Усе, што патрэбна, фарбы
Ім шчодра прырода дала.

Не раз тут страчалі, бывала,
Пеўневы галасы.
Ім губы зара фарбавала,
Што ззяла ў кроплях расы.

Бялілі ім шыі міла
Крыніцы — летам, зімой.
А валасы залаціла
Дзяўчатам сонца само.

* * *

Народ мой — высокае дрэва шматлістае,
якое ўсё весялей на Планеце гамоніць,
пускаючы новыя парасткі і галіны.
Карэнні гэтага дрэва —
гісторыя…

**Балада пра Хатынь**

Была на Зямлі (у Лагойскім раёне, на Беларусі)
веска сасновых хат — Хатынь.
Там гуляла ў вокнах сінь,
на сонцы грэліся гладышы і слоікі,
якіх уздзявалі на тын.
Там поле вясною аралі,
жытам і лёнам зямлю засявалі,
Там песні свае (такіх нідзе не пачуеш!)
на купалле і на дажынкі спявалі.
Там маці, выцягваючы з вузялка
скупыя рублі,
дачушцы панчошкі купляла,
А як гуляць маладу пускала,
выходзіла за вароты,
рог хусткі кусала.
Праводзіў хлопец дзяўчынку
да гэтай вось брамкі;
даверліва рукі свае міламу аддавала —
І ад вакна адыходзіла маці,
усю ноч вачэй не змыкала...
Аднойчы прыйшлі сюды людзі ў зялёных
фрэнчах
З арыйскімі сваімі ідэямі,
З кулямётамі
і запалкамі.
Вочы былі ў іх з халоднага лёду,
сэрцы — з каменю.
Кажуць, тады далека з дымам ляцеў

людскі развітальны крык.
Была на Зямлі (у Лагойскім раёне, на Беларусі)
веска сасновых хат — Хатынь.
Сёння на месцы Хатыні —
пустыня.
Хто галаву не схіліць,
пачуўшы пра гэта:
На цэлую вёску людзей
асірацела планета!
Сталі попелам сівым
і вочы, і рукі, і ўсмешкі;
Навек загінула (і ніколі ўжо не ўваскрэсне!)
людская душа — песні...
Нядаўна —
у памяць пра вёску Хатынь,
у памяць пра іншыя ўсе Хатыні —
Павесілі архітэктары
на яе папялішчы званы.
Падзьме вецер, які варот і аканіц шукае,
І — звоняць яны.
Звоняць званы.
Звоняць званы.
Ці чуеш ты, шар зямны,
Хатыні тваёй
званы?

## Хадыка

А між бароў, сярод імшары дзікай,
Дасюль вядзецца пасека лясная.
Багата дзіў аб ёй апавядаюць
І называюць гэтак жа—Хадыка.
*Ул, Сыракомля, 1847*

Вёска Хадыка (Нова-Цярушкаўскі сельсавет Салігорскага раёна), якая ўзнікла на месцы легендарнага ўрочышча, у час вайны была разам з людзьмі спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Дубы ды сосны. Хвошч ды вязель.
Жывіцы выстаялай хмель.
Я думаў: стрэне, даўгавязы,
Над звонкай студняй журавель.

Я думаў: сопочную казку
Раскажуць ліштвы, а ў акне
Адчыніць вейкі — калі ласка —
Блакіт нябесны ў сэрца мне.

Я думаў: ля прысад рабінавых,
На вуліцы, дзе мурава,
Акружыць стайкай вераб'інай
Мяне вясковая дзятва...

Дарэмна: у вянку яловым —

Вуглі ды некалькі цаглін.
Дыміць па печышчах вясковых
Расліна горкая — палын.

Той чорны дзень — як цень далёкі,
Ды ўсё запомніў гэты кут.
Па сёння — ледзь ступі — сарокі
Спалохана стракочуць тут.

**Песня партызана**

Ты думаў, фашыст,
што кінуўшы голае цела маё
Ў лёд сцен,
Ты ўсё ў мяне адабраў:
кашулю,
якая ад смерці халоднай ратуе;
край мой,
што буслам клякоча над галінастай вярбою;
мову маю беларускую,
што з веку крыніцай у хатах цурчыць,
не сціхаючы;
волю,
што крылы дае для самых высокіх палётаў.
Ды ты праλічыўся:
забыў ты пра песню,
якая ў сэрцы маім засталася.
І гэтая песня вярнула мне ўсё:
кашулю,
якая ад смерці халоднай ратуе;
край мой,
што буслам клякоча над галінастай вярбою;
мову маю беларускую,
што з веку крыніцай у хатах цурчыць,
не сціхаючы;
волю,
што крылы дае для самых высокіх палётаў!

* * *

Як анямеўшы,
стаялі тады мы
Пад талеркамі радыё...
Гараць гарады...
Градам
Білі словы па нас.
Як жа так дапусцілі?
Дзе мы былі дагэтуль?
Гарбелі спіны,
урасталі ў плечы берэты.
Так, мы былі ў сябе
(о, як мы забывалі на свет,
што рассцілаўся за вокнамі
ў мачтах і кветках),
Так, мы былі ў сябе —
у сваіх кватэрах-клетках,
у цэхах-клетках,
Так, у сябе—
у сваіх рэбраў
клетках...
І вось—
па галаве, як прутам жалезным:
Вайна!..
Не спіце ж, не спіце, не спіце цяпер —
на галовы, на рукі, на вочы,
на дзіцячую даверлівасць душ —
Бомбавы душ!
Бомбавы душ!
Маўклівыя,
мы адзявалі бушлаты,
Плугі свае і станкі пакідалі,
на плечы ўскідвалі
аўтаматы.
Ішлі —
заладзіць-забіць пралом
(ад Чорнага да Балтыйскага мора ў граніцы
і ў сэрцах пралом,
праз які ляцелі агонь, жалеза і смерць).
Чатыры гады (без аднаго месяца)
мы заладжвалі гэты пралом.
Не бярвеннямі, не жалезам,
не бетонам, не гравіем,
не цэглаю, не зямлёй —
Самімі сабой!
Самімі сабой!..
2О мільёнаў (гэта ўсяго па статыстыцы)
Легла, як скалаў, нас,
Каб заладзіць
Гэты пралом.

## Вучыцца ў Леніна нам трэба

Вучыцца ў Леніна нам трэба
Стойкасці:
ні вецер ледзяны,
што зносіў стрэхі ў Шушанскім,
ні шквал праклёнаў зрынутага класу,
ні лес штыкоў, што атачалі Край Саветаў,
Яго не пахіснулі нават.

Вучыцца ў Леніна нам трэба —
Мудрасці:
ён не трымаўся мёртвай літары ніколі,
як палачкі трымаецца сляпы,—
глядзеў жыццю ў вочы.

Вучыцца ў Леніна нам трэба —
Дзелавітасці:
ніколі не кідаў ён слоў на вецер
і не даваў жыцця балбатунам
(з дзвярэй яго,
нібы з бутэлькі корак,
выскаквалі яны).
Вучыцца ў Леніна нам трэба —
Працавітасці:
нібы патроны порахам,
ён запаўняў усе мінуты працай.

Вучыцца ў Лепіна нам трэба —
Смеласці:
ён свет перавярнуць
не пабаяўся!
Вучыцца трэба нам у Леніна —
Сумленнасці:
усёй эпохі нашай
стаў сумленнем ён!

## Герцан

Герцан выратаваў гонар
рускай дэмакратыі,
*У. І. Ленін*

Ляціць вазок. Раўніны снегавыя.
Бывай, мой край, бывай, бывай, Расія!
Бяру з сабой смугу тваю і зоры,
Тваё бары, прасёлкі, тваё гора.
Няхай слупы мільгаюць верставыя —
Я не ўцякаю ад цябе, Расія.
Я не цябе, Расія, пакідаю —
Кідаю бенкендорфаў, мікалаяў,
Ярмо сваё, ўладзіміркі, казармы
Ды вас, літаратурныя жандармы.
О як яны цябе ўсе акруцілі,
Аблыталі, Расія, аглушылі!
Так моцна спіш ты ў снягах. Паслухаць:
Ад мора і да мора — глуха, глуха.
А голас хто падасць — жандармаў зграя
Ўміг рот заткне тут, аплюе, аблае.
Расія, я не здраднік твой, я воін,
Я еду зброю гартаваць да бою.
Так, еду, ды з табою я да скону,
Я стану, знай, Расія, тваім звонам,
Праўдзівым, непадкупным і магутным,
Каб быў ва ўсёй імперыі ён чутны,
Каб цар дрыжаў, пачуўшы гэты звон,
Каб рухнуў вобзем самаўладдзя трон
І на абломках тых, пад небам сінім,
Нарэшце ўстала Новая Расія.

## «Гапон» В. Дуніна-Марцінкевіча ў мінскай кнігарні, 1855 год

— Ці бачыла, пані Альжбета:
Кніжка, пісаная беларускаю мовай! Ха-ха!..

— Як?! Гэтай хамскай, мужычаю,
пастуховай? Хі-Хі!..

— Мо і пісалі для хама,
што возіцца з гноем няспынна? Ха-ха!..

— Што спіць у бруднай халупе сваей
са скацінай! Хі-хі!..

— Мо пан аўтар зрабіць мужыка
грамацеем мяркуе? Ха-ха!..

— Чаго добрага, кіне пугу хам'ё
ды ў школу яшчэ пашыбуе! Хі-хі!..

— Стане вучоным мужык,
будзе пісаць трактаты! Ха-ха!..

— На асамблеі ў сталіцы
будзе сядзець депутатам! Хі-хі!..

— А можа, ў міністры
паперціся ў лапцях захоча? Ха-ха!..

— На трон каралеўскі
у шарачку заскочыць! Хі-хі!..

— Кіравацъ яшчэ ўздумае
намі, панамі! Ха-ха!..

— З зямлі гэтай нас прагнаць зажадае
нашымі ж бізунамі! Хі-хі!..

— Ха-ха!..
— Хі-хі!..

**Каліноўскі — апошняе слова**

Бывай здаровы, мужыцкі народзе.
*Яська-гаспадар з-пад Вільні*

Такі іскрысты сёння снег!
Такія белыя аблокі!
Тут, на зямлі,— не ў сне, не ў сне! —
Апошнія лічу я крокі.

Да перакладзін чорных тых
(Чаму бялеюць іх сукі?)
Ўсе дваццаць шэсць гадоў маіх
Вядуць стальныя два штыкі.

Даруй мне, тата, і бывай:
Я не вярнуся ў нашу хату.
Больш не адчуць рукою, знай,
Тваёй далоні вузлаватай.

Даруй, Марыська, родны птах,
Я і цяпер, нібы дарункі,
На збітым твары, на губах
Нясу твае ўсе пацалункі.

Даруй, даруй: б'е час разлукі
І тую шыю, што твае
Так моцна абвівалі рукі,
Вяроўка сёння абаўе.

Даруйце мне, што ў час юначы

Сябе я гэтак не бярог.
Паверце вы: я жыць іначай
Не мог, не мог, не мог, не мог.

Вы знаеце: ні канакрадам,
Ні казнакрадам я не быў
І казытлівы пах улады,
Паверце, ў ноздры мне не біў.

Я не таму йду паміраць:
Мне напляваць на тыя троны,
На каралёў усіх кароны,
На крык іх скарбаў — напляваць!

Пячэ мне сэрца боль другі:
Як ластаўку, на згубу
Няшчасны край мой дарагі
Дзярэ арол двухдзюбы!

Мужык, у крук сагнуты, тут —
Ці спёка, ці разводдзе —
Валочыць паншчыны хамут
З стагоддзя у стагоддзе.

Цар толькі прывід волі даў:
Па ўсіх палях наўкольных
Адзін бізун, як і гуляў,
Ізноў гуляе вольна.

Ды што цару народа енк,
Што слёзы паланянкі:
Абы ён толькі піў ды еў
Ды ладзіў пагулянкі.

Цары ж са смакам хочуць жыць,
Жыць з сэнсам і без сэнсу!
Народ ім трэба, каб давіць,
Народ ім трэба, каб даіць,
Каб, нібы па масту, хадзіць
Ім па касцях і сэрцах!

Ну, а каб легка клаўся ён
Пад царскія падэшвы,
Вылазяць зграі халуёў
Для «апрацоўкі грэшных».

О, я вас знаю, халуі,
Пасобнікі разбою!
Адна ў вас мара — на чаі
Вам кінулі б паболей.

Перад дваром вы — бараны,
Угоднікі, маўчальнікі —
Вам хоць бы выбіцца ў чыны,
Пралезці б у начальнікі.

Што праўда вам, што вам народ,
Што Бацькаўшчыны гора!
Вам свой напхаць бы толькі рот,
Набіць ядою горла.

Вы ўміг тупы цара дэкрэт
«Правесці ў жысць» гатовы.
З усіх амвонаў і газет
Нам «чысціце» галовы.

А пікні вам — як чорны зброд,
Вы ўсіх распяць ахвочы.
Заткнулі вы народу рот
І завязалі вочы.

О так!
З народа можна ўсё рабіць:
Масты масціць, вяроўкі віць,
Гнуць дугі, круціць атосы,
Калі ён нямы, безгалосы!

Вось так, народ, ты ланцугі
І цягнеш век, нябога.
Табе убілі у мазгі,
Што гэта ўсё ад бога.

Ты за цара ў агонь прывык
Ісці, хлуснёй аглушаны,
А цар тваёй рукой, мужык,
Цябе ж самога й душыць...

Калі на край мой крумкачы
Ляцелі хіжым роем,
Вучыў ты, бацька: лепш маўчы
Ды беражы здароўе.

Я не паслухаў, выбачай:
Безабаронны, клікаў край.

І я пайшоў у навальніцу,
У бой зацяты — нож на нож.
«Мужыцкай праўды» бліскавіцай
Я рассякаў нямую ноч...

Цяпер — бывай, бывай, народ,
Даруй за мой канец такі.
Зрабіў я ўсё — на эшафот
Вядуць стальныя два штыкі.

Усё маўчыць. За небакраем —
Палёў заснежаных абрус.
Мая прыгнутая, глухая,
Мая льняная Беларусь.

Там да сяўбы — мне добра бачна —
Ужо ладзяць новыя плугі.
Ты знай, жандар: не ўсё ў нас страчана —
У далях спее бой другі.

На скатаванае зямлі
Збірай жа, люд мой, новы гром.
Я знаю: прыйдзе час, калі
Тут станеш ты гаспадаром.

*Бывай здаровы, мужыцкі народзе,*
*Жыві у шчасці, жыві у свабодзе*
*І часам спамяні пра Яську свайго,*
*Што загінуў за праўду для дабра твайго.*

## Бацькаўшчына

На пясчаным грудку Зямлі
(там растуць арабіны і слёзкі)
Веска наша жыве...
Ніводзін лівень і снег,
ніводзін вецер, што заўсёды
ляціць куды-небудзь,
Не абамінае двор наш і хату
пад небам.
Дні, як белыя ветразі,
прыплываюць да нас
з усходняга небакраю,
За бярозы чапляюцца...
Кожны — па-рознаму звоніць,
на чыстых граючы струнах,
Кожны — як ясны пярсцёнак,
як дарагі падарунак.
Мы іх ад сябе не пускаем,
сцеражом,
як у Заўтра кладку:
Хай у вочы плывуць,
Хай у вушы плывуць,
Хай у жылы плывуць
да астатку.

**З календара хлебароба**
**(успамін)**

Снягамі ўжо аселіцы
Засыпаны без ладу.
Іх аддалі мяцеліцам
У поўную уладу.

Ды ў бацькі твар — як сонца,
Разгладзіліся зморшчыкі:
Яму мех шчасця сёння
Напелі калядоўшчыкі.

Напелі, напрарочылі
З калматаю «казою»
Пра поле, дзе, ахвочыя,
Растуць жыты лазою,

Дзе каласы пад ліўнямі
Згінающца вясёлкамі,
Дзе звонка ночы жніўныя
Гукаюць перапёлкамі...

І бацька ўжо не чуе
Мяцеліц свіст няроўны.
Ад рання штосьчаруе
Каля плугоў-баронаў.

Ён думку — сон пра лета
У сэрцы ўжо мілуе.
Нанова ўсе палеткі
У галаве малюе.

## Дзядзька Адам

У вёсачцы нашай некалі жыў дзядзька Адам.
Казалі, і птушкі ніколі не зачапіў дзядзька Адам.
Касіў, поле араў, баранаваў дзядзька Адам,
Сыноў і дачушак малых гадаваў дзядзька Адам.
Нідзе ў жыцці не бываў,
апроч вёскі ўласнай глухой, дзядзька Адам,
Поезда нават не бачыў за вечнаю працай сваей
дзядзька Адам,
Век прахадзіў між знаёмых палёў і лясоў
дзядзька Адам,
А паміраць аж за трыдзевяць земляў пайшоў
дзядзька Адам.

* * *

Мова зямлі маёй! Мова бацькаўшчыны!
Пачую твой гук на чужой зямлі,
І — бумкае чмель у гародчыку басам,
Трубяць за возерам жураўлі.

У хаце бярвеннай, ля печы — далёкая —
Ходзіць мацерына чапяла.
На плоце певень — жар-птушка — галёкае,
Збудзіўшыся, бзыкае ў шыбе пчала.

Дарма мне казалі, што ў пальмавым краі
Я нават успомніць цябе не змагу,
Што іншая песня — мелодыяй раю —
З душы маёй выцесніць просты твой гук.

Мова мая!
Для мяне ты заўсёды —
Сонца вясновага цёплы прамень,
Дзіва ляснога поўныя соты,
Рэчка, што асвяжае ў сухмень.

* * *

А дзень, як гарбуз паласаты,
Каціўся у змрок рабы.
Няслі нада мной пасаты
Хмар карабы.

Развіталася з сынам
Шэрае поле і гаць.
Ішоў я па свеце сінім
Долю шукаць.

Блукаў я, як пад каронай,
Пад лівадзійскай зарой.
Стаяў кіпарыс калонай
Між мной і гарой.

Краінаю вінаграду
Вазілі, госця, мяне.
Ішоў я між кветак,
Рады
Вечнай вясне.

Ды дзе б я ні быў,
Пасаты
Мой ветразь няслі ізноў
Да матчынай — з сосен — хаты
І нашых рыжых ільноў.

* * *

А ўсё ж я рад, што ў гэты свет
Запушчаны з нябыту.
Між зор расквечаных і бед —
Жыцця майго арбіта.

Шмат па шляху маім было
Каменняў ды завалаў.
Нямала мне у твар раўло
Гіенаў і шакалаў.

Мяне чынамі-чыгуном
Шмат хто давіць быў рады,
Пранізваючы, як ражном,
Высокаю пагардай.

(І сёння сніцца мне парой
Эсэсавец бяльматы,
Што шомпалам у бок пароў:
«Парцізан быў у хата?»)

Я палажыў нямала сіл,
Каб груз адкінуць гэты.
На свой, хоць сціплы, небасхіл
Я вышаў, як камета.

Нідзе не кленчыў я,
Рабом
Не лез пад бот вяльможны,

Рукамі ўласнымі, гарбом
Браў свой прыступак кожны.

Была апорай мне зямля,
Што ў гэты свет пусціла.
Яна мне — нават і здаля —
Ўлівала сілы ў жылы.

Упасці духам мне яна
Ніколі не давала.
Калі быў вычарпан да дна —
Лячыла і ўздымала.

Я з ёю развяду бяду
І саўладаю з громам.
Яна заўсёды на віду —
Зялёным касмадромам.

**Завуць касманаўтаў планеты**

Павеялі новыя ветры
Над светам зялёным лясным.
Завуць касманаўтаў планеты
Святлом неспакойным сваім.

Мы сыдзем, далёкая зорка,
З нябёс на тваё камяні.
На дзіўных, нязнаных узгорках
Зямныя запалім агні.

Зямную, любімую песню
Спяе касманаўтаў сям'я
Пра шчасце, што ходзіць ля вясніц,
Пра любую зорку — Зямля.

І зноў у блакіце ракеты
Пакінуць свой вогненны след.
Завуць касманаўтаў планеты
У новы, расчынены свет.

* * *

Калі б не свяціла Сонца,
 Ці ж быў бы я?
Калі б Зямля не кружыла,
 Ці ж быў бы я?
Калі б не было ў мяне Маці,
 Ці ж быў бы я?
Таму і слаўлю я Сонца,
Таму і слаўлю Зямлю я,
Таму і слаўлю я Маці,
Слаўлю жыццё!

**Санцаход**

Быў нада мною Заг.
Да неба нос задзіраўся
 у бюракрата-зага.
О, як пільна сачылі
Загавы вочы-шылы,
Каб хадзіў я
 толькі па яго інструкцыях,
Без зігзагаў,
Каб слова яго
 (гаворачы, ён глядзеў
 з высокай сваёй вышыні)
 я лавіў на ляту,
Каб моўчкі, ківаючы галавою — але, але! —
 выслухоўваў я
 любую яго лухту,
Каб я забываў на сябе,
 каб рабіў толькі так і так,
Каб перад ім — о, ён вялікі у гэтым свеце!
 поўзаў я, як чарвяк.
Ды я не думаў
 яму паддавацца,
Выкручвацца і згінацца.
Я нёс —
 маё права! —
Яму ў зубы
 заяву.
Пытальнікам вылупіў вочы.
 Так, я штатнае месца

па ўласнай ахвоце
вызваліць мушу.
У павучыную сетку вачэй
хай ловіць іншую муху!
Нада мною ж будзе ад сёння
Справядлівейшы самы загадчык —
Сонца.
За яго настроем
толькі і буду сачыць дзень за днём,
як сланечнік.
Аднаму яму
буду я падпарадкавацца
вечна.
Зялёная Дуброва — яго абход.
Сонца ніколі яе не мінае.
Тут будуць маімі —
кожны яго узыход і заход,
яго лясы і ўраджаі,
Яго — пад Ласінай балоцінай — клік,
яго арахі за Падліп'ем,
Яго раўкі,
Яго метлюкі,
яго салавей у ліпе...
Тут буду я жыць.
Журавель — у зары.
Старыя засаўкі ў лопуху.
Тут некуды ў зоры
гадоў вятры
нясуць нашу хату, як лодку.
Даўно нас выветрыла з яе,
не знаю, якой залевай.
Як птушкі з гнязда — хто куды —
разляцеліся мы
па голлях жыццёвага дрэва.
Устане маці.
Месяца грай.
Клятчатымі коўдрамі
ложкі засцелены.
Дзеці! Дзеці!
Гукай не гукай —
толькі вецер за сценамі.
Сышлі
(цяпер адно пісем чакай).
Што ж, не было тут дзецям разгону.
Пайшлі па свеце
шукаць свой хлеб,
сышлі з дому.
У вушах — галасы, галасы.
(Пецярых, без бацькі — бацьку забрала вайна —
нас выхавала маці.)
У кожнага зараз
галінка свая —
абжывай ды мацней трымайся.
У Валі — швейнае атэлье ў «раівоне»
(з іголкі жыве Валя);
У Зіны — мінскі трактарны завод
(як яна церпіць
той грукат і скрогат?);
У Аліка — нейкі Белсаўпроф

(хоць і няцяжкая ў яго работа,
але зарабляе нядрэнна);
У Яні — завод у Старых Дарогах,
на якім робяць сітро.
У Косціка...
Адзін толькі Косцік
галінку сваю
знайсці дагэтуль не змог.
Усё не адвыкне ён ад зямлі,
што — як малы быў — плугам чапаў,
усё не забудзе бацькаў парог.
Кінуў работу, пісаў.
Думае жыць з мазаля,
вольным хлебам
у вольным свеце —
Без начальства, без службы...
Дзеці, дзеці...
. . . . . . . . . .

З далёкай вандроўкі
(Вы калі-небудзь бачылі,
Як ходзяць Гончыя Псы, Андрамеда і Рыбы?)
Вярнулася сёння Сонца
да лагоў Зялёнай Дубровы.
Яго прачакаліся тут.
Захапіў без яго усе землі Мароз —
акупант гэты люты,
Зачыніў прыроду на свае замкі,
Спыніў усяго жывога токі.
Жахнулася Сонца:
як апусцелі яго, багатыя на раслінасць, надзелы
Дзе падзяваліся птушкі?
Куды пазнікалі мядзведзі,
і вавёркі і вожыкі?
Працёршы воблакам твар
(начавала Сонца за Галым Балотам)
узялося яно за працу.
Небам, небам — пайшло адмыкаць
(якія светлыя і бездакорныя ў яго ключы!)
зямлю-маладу са срэбнай цямніцы.
Выпусціла — ну ж і вясёлы лес! —
лісце бяроз і калін
з цесных пупышак-каморак,
Вольную волю дала траве-мураве,
Крапіве — ля платоў,
дурнап'яну, чабору.
Дачуліся птушкі ў сваёй эміграцыі
пра высокае шэсце Сонца,
Ляцяць — паспрабуй спыні тыя крылы! —
да мілых бацькоўскіх дуплянак,
да купін сваіх і соснаў.
Злятаюцца (колькі крыку і гаму!)
жаваранкі і шпакі,
удоды, гусі, заранкі,
Ластаўкі, качкі, зязюлі, буслы,
кані і канаплянкі...
Дадому! Дадому!
Да тумановага краю!

Хаджу я пад небам — нашай сіняй страхою,
і — вырай за выраем —
іх сустракаю.
Бо і сам я — гэткая ж птушка.
Правільней, я не ведаю, хто я.
Завяла мяне сцежка-вілюшка
У няведамыя травастоі.

Што за вербачкі там, ля даліны?
Ці не вы гэта, Пераваловкі?
О як ціха! У гуле чмяліным —
Толькі я ды аблокі.
. . . . . . . . .

Тут усё
душу маю гоіць.
Гай —
хвоі вечным спакоем
і карою сіняй асін —
гоіць;
Караністая сцежка
(унь прабягае па ёй мурашка
з рыжай хваёвай іголкай)
гоіць;
Божая кароўка, што з неба ўпала
мне на рукаў,
(андрэйка, андрэйка,
пень ці калода,
дождж ці пагода?)
гоіць;
Бяссмертнікаў і павояў лапінка
на леташняй пасадцы сасны
(тут рай матылям і яшчаркам)
гоіць;
Трыпутнік і лебяда,
васілёк і зялёнае жыта
над глухой баразною
гоіць.
Поле маё — гоіць,
Дарога — гоіць,
Неба — гоіць.
(На душы маёй — раны, раны.
Мусіць, таму, што дала мне маці душу,
танчэй ад мембраны.
О, хто яе не чапаў,
не рваў яе абцугамі!
О, хто яе не таптаў,
не лазіў па ёй з нагамі!)
Сёння ўсё,нават паветра маёй Зялёнай Дубровы,
душу маю
гоіць.
А найлепей за ўсё
самы стары і самы выдатны на свеце доктар —
праца любая —
гоіць.
. . . . . . . . . . . . . .

Я — успомніў сябе.
Я ж — сялянскі дзяцюк.
Якая моцная ў мяне рука!

Ляціць па вёсцы — цюк, цюк! —
Стук майго малатка.

Як гуляю, раблю. Праца — дар.
(А здавалася, што ўжо зусім я ў паперах зачах.)
Як хораша жыць. Я — гаспадар.
Я сам расту ў сябе ў вачах.
. . . . . . . . . . . .

Потым ускіну на плечы касу —
У траву, у расу
Панясу.
Сілай мераючыся,
Стану з дзядзькамі вясковымі ў рад,
Рад.
Недзе там, за Канаваю,
Не затоптаны мо, як след,
Стыне мой след.
Колькі там пабывала вятроў,
Праляцела снягоў!
(Паспрабуй злічыць!)
Толькі радасць дзядоў,
Што свой хлеб мазалём здабывалі,
Я не здолеў забыць.
За шмат год не прыжыўся
(мо гэткі падвой?)
Я на глебе другой.

Што рабіў я,
не ведаў,
нашто я раблю.
Я любіў
і не ведаў,
ці праўда люблю.
Галава ўжо была
у мяне — не мая,
І рука мая
    не мая.
Я не ведаў,
    дзе я,
Дзе —
    не я.
Павуціну,
    што, быццам бы кокан,
    мяне начала аплятаць,
Я рашыў разарваць!
Адуванчык, сваці,
    ліст, спявай на вярбе —
Я вяртаюся
    да сябе!

Намянташу касу,
    абатру расой
І пайду —
    адхінайся, калгасны мой луг! —
Паласой,
Паласой.
Буду кідаць, як вежы, стагі,
    буду поле, што пахне дажджамі,
    араць.

Буду кожны свой дзень
(што нясуць жаўрукі),
нібы свята,
страчаць.
Тут, пад Сонцам маім,
у вялікай сяўбе,
Адшукаю сябе!

* * *

Зноў вярнуўся я ў бацькаў свет палявы —
У першабытнасць дрэў і травы.
Авяваюць мяне
вольныя крылы радзімы —
Вёсны ды зімы.

О як хораша — толькі з парога — піць
Маладыя настоі раніц!
Аб галінку шыпшыны лясной
(Як матылі, яе кветкі абселі)
палец раніць!

Грае вечную арыю бор —
Я пайду без дарог, як вецер.
Можа, ўбачу,
як ладзіць бабёр
Свой прытулак
на гэтай планеце.

Блісне мне ля тваёй дзеразы
Бліскавіца-яшчарка, лесе.
А мо стрэну пагляд казы,
Што пасецца ў зялёным лесе?

Там з-за хвой,
дзе сцежка лася,
З-за галін вербалозу, здалёку
Мне, як радасць, адкрыецца ўся

Азярына — зборнік аблокаў.

Будзе плёхаць хваля ў трысці,
Асыпаць пялёсткі
калiна...
Гэта шчасце, што ёсць у жыцці
Родны бацькаўскі свет каляiнны!

* * *

Вось ізноў — праз безліч гадоў! —
у руках маіх простая пуга сырцовая:
я пасвіць каровы ганю
(Што ж з таго, што на імя маё
навешана тытулаў розных вучоных).
Сонца яшчэ не прыйшло на зямлю.
Але яно недзе ўжо блізка:
пабялела на ўсходзе унь неба,
вераб'і прачнуліся ў бэзе,
І певень, першы саскочыўшы з седала,
шукае курам на двары пачастунак.
Каровы, вытураныя жаночымі кухталямі за брамы,
стаяць сярод вуліцы,
выцягнуўшы ўперад галовы,
І сонна жуюць сваю жвачку.
Я доўга хаджу ад адной да адной,
пакуль не скранаю нарэшце іх з месца.
Цячэ па вуліцы статку рака.
На выгане яна разліваецца ва ўсе бакі.
Цяпер на планеце адзін толькі гук —
грызуць каровы расяную мураву!
(І што я рабіў дагэтуль?
Для чаго разменьваў свой,
і без таго скупы, век?)
Булькоча ручай недзе на дне зарослай канавы
(Мусіць, трапіўся камень яму на шляху),
Зялёная жабка, скокнуўшы неўпапад,

застыла ў мяне ля нагі
(думае, што я не бачу яе між травы),
Разгалісты дуб, не надта стары,
але з чорным дуплом унізе,
(і ў каго падымаецца рука тут класці агонь?)
Яшчэ зусім не прачнуўся:
не зварухнецца на ім
нават ліст.
А ў небе, узляцеўшы з зялёнага цёплага жыта
і ля хмаркі суняўшыся, як верталёцік,
Запеў — такую старую,
знаёмую і такую новую песню
жаўранак —
шэрая птушачка палявая.
А мо гэта зусім не жаўранак?
Мо гэта сэрца само
песню бацькоўскаму краю спявае?

## Сцежкі маленства

Дарэмна лаеш мяне ты, крытык,
Дарэмна поўніш газету крыкам,
Дарэмна колеш шпількай насмешкі,
Што я апяваю маленства сцежкі.
Я буду ўсё роўна — не прызнаю тваё вета! —
Клікаць вобразы роднага свету.
Там ліпы як ліпы і вербы як вербы —
Растуць як хочуць пад вольным небам.
А сцежкі тыя, палявыя дарогі
Пратоптваюць самі людскія ногі.
І салавей там не ў клетцы — вольна
Пяе салаўісе ў цёмных вольхах.
У ясным тым свеце — ў нябыт ён не кануў! —
Ніхто не хавае за пазухай камень.
Усё ў вачах там напісана шчыра,
Там два на два — заўсёды чатыры.
Там чорнае — чорнае, рыжае — рыжае,
Слуп ёсць слуп і грыжа ёсць грыжа.
Там з нараджэння жыве ў мяне маці —
Садзіць картоплю, сее макі,
Ідзе («хоць каня брыгадзір калі дасць») у поле:
Кланяецца буракам,
Прарэджваючы ды прапалваючы,
Лён бярэ на загоне, між двух палікаў —
Не зарасла хаця б яе «пайка».
А вечарам дома — толькі ўпраўляйся — працы:
Гарбузнік сячэ для свіней
(«ненажэры, каб на іх пранцы»),
Агуркі палівае, куранят частуе крупою,

Каля печы круціцца з чапялою...
Усе вяскоўцы мае
(хто час ліхалецця не помніць?),
Як шклянку, дзень свой працаю поўняць.
Даўно яны ведаюць, знаюць, як трэба,
Колькі каштуе скарынка хлеба.
Там са стала (не думайце, што з-за грошай!)
Ніколі не скінуць пад ногі крошак.
Па сцежках тых родных так ходзіцца лёгка:
Там хочацца лётаць, з рэхам галёкаць.
Там можаш грому смяяцца вясёла,
Пусціцца па лужынах пад вясёлку.
Там ходзяць — к ночы — туманы нячутна,
Пад ногі сцелецца лістам трыпутнік,
Святляк запальваецца за гародамі
І мак таўкуць камары — на пагоду...
Мы ж сцежкі маленства чамусь забываем,
Сябе ад сябе — дзівакі — адрываем.
Душу нашу губяць з узростам наросты:
З'ядае яе кар'ерызму кароста,
Смоўж зайздрасці смокча і смокча штоночы
Ці шашаль нажывы ушчэнт яе точыць.
Сцежкі маленства, сцежкі маленства!
Вы — лекі ад розных людскіх калецтваў.
Па вашай траве, па вашых росах
Часцей бы ступаць нам нагою босай,
Часцей бы да вас нам усім прычашчацца,
Ад бруду ўсялякага ачышчацца.
Лячыцца вашых крыніц чысцінёю
Ды матчынаю слязою святою.

## Перакаці-поле

Расла травінка на вясёлым полі —
У родным свеце, у расяным прыволлі.
Але аднойчы злосны ўсхадзіўся вецер
І, вырваўшы, панёс яе па белым свеце.
І вось лятае травінка ад поля да поля,
Сядзе і тут жа ўверх уздымаецца —
перакаці-поле.
Дзе ёй спыніцца, дзе ўкараніцца — не знае:
Не міла травінцы глеба чужая.
Коціцца далей і далей.
Такая ўжо доля:
Век між зямлёй і небам перакаці-поле.

## Мурашка

Ад цямна да цямна —
на нагах мурашка.
Сук, большы ў сем раз за сябе,
схапіла і бяжыць: не цяжка!
І выхадных ёй не трэба,
снуе і снуе ля свайго палаца,
Што значыць —
любая праца!

## Жураўліныя ягады

За лесам сінім, на градцы нязнанай
Спялілі ягады жураві.
А ўвосень сабралі і ўсім караванам
Панеслі ў кошыках да сінявы.

Хацелі данесці да цёплага поўдня
Роднага краю дары.
Ды свіснула бура і з дзюбаў раптоўна
Сарвала кошыкі ўсе ўгары.

Як сонцы маленькія, на імшары
Скаціліся ягады з вышыні.
Ад той пары жураві і зараз
Шукаюць, шукаюць іх дзень пры дні.

Знайшлі іх і людзі, аблюбавалі,
І вось, калі загарацца кляны,
Ідуць на балота і, нібы каралі,
Збіраюць у кошыкі ды ў збаны
Чырвоныя ягады жураўліныя —
Журавіны.

* * *

Замятае, лісцем замятае
Поплаў, пасекі, раўкі далін.
Завядзі, дарожка залатая,
У краіну вольх і арабін.

Там цвіце — мой сон заўсёдны — верас,
Па нізах віеціа дзераза
І блішчыць расінка раннем шэрым
На травінцы кожнай, як сляза.

Хай бягуць за голлямі аблокі...
Годы уцякаюць — не лічы...
Глянь, пад елкай — рыжык крутабокі
Ды баравікі, нібы карчы,

Ды ў агні нягаснучым асіны —
Не атушаць іх і туманы —
Сняць свае, зялёныя і сінія,
Чэрвеньскія ночы, як чаўны...

* * *

Так кожнаму наканавала
Доля — міл ці не міл:
Усе мы адыдзем памалу
За небасхіл.

Ды ў сонечным свеце, за брамай,
Залётная каня, крычы! —
Будуць цвісці гэтаксама
Яблыні і касачы.

Белай сям'ёю крылатай —
Новага лета паслы —
Будуць на поплаў за хатай
Зноў апускацца буслы.

Я зноў іх убачу!
Ахвоча
На свет гэты, тут і там,
Будуць глядзець мае вочы,
Што ўнукам я перадам.

## Закон вады

З дарогі! Вада лёд прарвала!
Бачыце, бачыце,
як яна рынулася на волю —
вал за валам!
Хутчэй, разявака:
лёд
вада
прарвала!
О як яна загаварыла,
запела,
забушавала!
А ўсю ж зіму пад лёдам,
як лінь, стаяла.
І не было цішэй вады...
А гэта —
вада лёд прарвала!
Бяжыць,
абганяючы самую сябе,
зрываючы палі, платы, маладая,
Спяшыць
запоўніць нізы ўсе і ямы да краю!
Такі — закон вады:
вада пустаты не трывае...

* * *

У мяне ёсць мара глыбінная:
Здаць мясцкому ўсе ключы
І з сталіцы, як з лабірынта,
У лясныя нетры ўцячы.

Пасяліцца ля песні чыстай —
Нетаропкага ручая,
У сядзібе зялёналістай
Бестурботніка — салаўя.

Ды пакуль пачакайце,
Лясныя нетры,
Ручаёк булькатлівы,
Баравое паветра.

Я шчэ маю сяброў,
Без якіх
мне нідзе
не ўсядзіцца, не ўспіцца,
Я шчэ недругаў маю,
З якімі
ніяк не магу
не счапіцца!

# Вырай

* * *

Далёка ад азяродаў,
там, дзе між хмарамі-марамі
зоркі ледзь-ледзь мігцяць,
Гусі — га-га! — ляцяць.
Над прыгорбленымі стрэхамі
(што маўчаць каля ліп нерухомых),
Над гразёю — аж дрыжыкі! — вуліц,
над блішчастых лужын холадам,
Над гарадамі-сотамі
(дзе ў светлых ад электрыкі вокнах
снуюць людзі ў піжамах бяссонна),
Над соткамі
(якія хавае змроку заслона),
Над прыазёрнымі чаратамі,
над маякамі,
над вякамі,
Як гуслі —
Гусі.
У вырай, у вырай, у вырай —
Гусі ляцяць.
Ізноў ім, ізноў ім, ізноў ім
за далячыняю далячынь
Звонкім ключом адмыкаць.
Будуць пад імі плысці
рэк паясы
і ветрам абсвістаныя даліны
Украіны.
Са сваёй вышыні

яны павітаюцца
З аграмадай-Эльбрусам
пад белым абрусам.
Пройдзе паціху
Пад крыламі іхнімі,
Як Зямлі блакітная латка,
Адрыятыка.
А там —
мурожнай саванай-выганам —
гэй, прапусці, маладая вясёлка-арка!
Афрыка...
Далёка ад азяродаў —
што ім дарогі і межы,
што ім граніцы дзяржаў! —
Гусі ляцяць.
Дзікія гусі
ляцяць.

* * *

*Памяці Л. Баразны*

Жыў хлопец. Мастак. І былі ў яго скарбы —
Вялікае сэрца і ў скрыначцы фарбы!
Браў пэндзаль у пальцы ён не для забавы:
Хацеў ён людзям трошкі сонца прыбавіць,
Адкрыць неадкрытыя колеры радуг
І ў сэрцах пасеяць яшчэ адну радасць!
Ды вось — перастрэлі хлапца два тупіцы,
І свет, што ў фарбах ляжыць яго,
больш не раскрыецца!..
О, людзі, высокае племя! Па-брацку
Нам трэба б за рукі ўсім разам пабрацца...
Няўжо не асілім мы гэтую крыўду людскую —
заўчасную смерць?

## Лісце

На дрэве — лісце. Добра ў небе сінім.
Пра вечнасць сні...
Але раптоўна — сівер,
І ліст за лістам — у траву, у прах.
А мы?
Не, мы — не лісце на вятрах!

## Зярняты

У поце, у працы здабыты зярняты.
Нямыя, драбнюткія, спіць у вас Заўтра.
Спіць Час, сняць Падзеі, мае ўсе надзеі..
Хаця б зберагчы вас ад лютай завеі.

* * *

Не веру я, што ў нейкі век
Уладу возьме атам
І сваё месца чалавек
Саступіць аўтаматам.
Я знаю, прыйдзе час, калі
На злосць расістам розным
Скрозь запануе на Зямлі
Непераможны розум!

* * *

Чалавек — бог,
Чалавек — раб.
Чалавек скруціць Казбек у рог,
Чалавек на нагах не трымаецца:
так аслаб.
Чалавек, чалавек —
Загадка,
якую разгадваю век.
Я ведаю пэўна:
ёсць у чалавека сіл незлічоных скарб,

Ды часам іх кіпцюрамі сваімі
    трымае раб, як краб.
І так спраку веку —
Ідзе вайна жорсткая (хоць і нябачная)
    у чалавеку.
Змагаюцца бог і раб,
Сіла і слабасць,
Святло
І тло.
Хто — каго?
Хто — каго?..
О якім бы прыгожым быў свет,
Каб
У чалавеку
Загінула ўрэшце немач яго —
Раб.
І перамог
Прыродны яго ўсемагутнасці бог!

* * *

Аднекуль з-пад воблачка —
    любуйся любы! —
Злятаюць на мой падаконнік
    птахі нябёс — галубы.
Чысцяць дзюбамі пер'е — вур, вур.
Абадкамі вачэй
    ловяць раніцы сіняву.
Галубы, галубы —
Яны ніколі не вешаюць галавы.
Яны сумаваць не ўмеюць,
    галубяцца
        любою
            пароюю.
Натряпяць на хлеба скарынку —
    падзеляць заўсёды
            пароўну.
Я ніколі не бачыў,
    каб біліся яны між сабою
За ежу ці месца
    для гнёздаў сваіх пад страхою.
У жыцці для іх
    многа не трэба:
Адно
    блакітнае неба!
Жывуць у ім, купаюцца ў ім.
    Калі ж адпачыць захочуць,
Злятаюць на мой падаконнік
    І — ціха вуркочуць.
Вуркачыце ж сабе,
    вуркачыце —
Людзей жыць
    вучыце.

* * *

Усё паўтараецца з веку ў век:
Ад зары да зары
    птушкі пяюць бесклапотна на дрэвах,
А ўначы засынаюць спакойна

на голлі між роснага лісця.
Спяць і, мусібыць, сняць,
як і ўсё на зямлі, пра шчасце,
Нават і блізка не падазраваючы,
Што ў гэты час прачынаюцца іншыя птушкі — совы,
(Хаця якія гэта птушкі —
яны ж і спяваць не ўмеюць!),
Лётаючы ад дрэва да дрэва,
яны свае прагавітыя кіпцюры
упускаюць у птушак сонных —
І гіне за песняй песня.
Раніцай зноў прачынаюцца ўцалелыя птушкі
І, не заўважыўшы нават,
што гэта ж няма іх сябровак,
і зноў бесклапотна пяюць, на дрэвах.
Птушкі, як вам сказаць пра небяспеку?

* * *

Ліст
легкакрылай чайкой
З клёна — свайго гнязда —
Ляціць у палёт...
Ды страчае
Яго
каляін вада.
Ніяк ліст паверыць не хоча
У несправядлівы лёс.
І доўга ў вадзе лапоча,
Рвучыся
у сінь нябёс.

* * *

Бываем мы часам,
што пушчы, запушчаны,
Ідзём па свеце,
як невідушчыя.
Нават ад чорнага
белае
Не заўсёды адрознім
смела.
Мы блытаем, блытаем
вечна
Авечку
з воўкам у скуры авечай.
І часта —
ад роспачы як не крыкну
Прымаем за чыстую праўду
крыўду.
Ля сэрца нават
яе хаваем,
Яе гадуем,
яе люляем,
Покуль яна —
крыўда ёсць крыўда! —
Нам жа пад сэрца
нож не усадзіць
крыва.

* * *

Жыццё пражыць —
не поле перайсці.
Усё тут будзе:
і любоў, і здрады,
І сад, якому зноў і зноў цвісці,
І песня, і ярмо, і барыкады!

**Саксаул**

Слаўлю саксаул я:
і ў пустыні,
Дзе вятроў раз'юшаных разгул,
Ён прабіўся скрозь пяскі крутыя
І цвіце па-свойму,
саксаул.

* * *

Мы б'ёмся над рыфмай,
рвём жылы на гонях,
Ідзём — за ўсмешку адну! —
у агонь мы,
Клён садзім,
ляцім у захмар'е знічкаю
Шукае, шукае душа гармоніі
У свеце негарманічным.

* * *

Мы ў гэты свет на нейкі міг прыйшлі
І чалавек, і звер, і птушка, і расліна.
Усе мы мацеры адной — Зямлі
І па-братэрску, каб цвісці маглі,
Адзін другога
берагчы павінны!

# Хіцер - Зміцер

**Маўчанне**

Я чуў, што маўчанне — золата,
Што лепш за ўсё чалавеку —
Жыць без голаса.
Немы крык —
распранаюць жанчыну на вуліцы,
Гром —
б'юць бандыты суседа ў жывот нагцакамі,
Але —
трымай язык за зубамі!
Дык хіба ж гэта золата?
Зброя мяшчанства —
маўчанне.

* * *

Мая хата з краю,
Твая хата з краю,
Яго хата з краю...
О, гэта ж была б такая лафа
для злодзеяў,
для гвалтаўнікоў,
для забойцаў,
для тыранаў,
Калі б ўсе хаты стаялі з краю!

## Хіцер-Зміцер

Вырастаў у пасёлку адным Зміцер
Па прозвішчу Хіцер.
Не любіў працаваць Зміцер —
Любіў паляжаць Хіцер.
Вось толькі есці часта хацеў Зміцер —
І пачаў шукаць лёгкага хлеба Хіцер.
Надумаў знайсці такую работу Зміцер,
Каб менш зрабіць, ды больш зарабіць, Хіцер.
Хацеў падацца ў навуку Зміцер,
Але пакуль вучонага хлеба паясі,
Богу душу аддасі —
Развважаў Хіцер.
Пайсці на завод наважваўся Зміцер,
Але ж трэба пацець там штодзень —
Ізноў адмаўляўся Хіцер.
Рашыў не шукаць гучнай пасады Зміцер —
Убіўся на складзік гандлёвы Хіцер.
Праўда, зарплату маленькую меў тут Зміцер,
Але ніколькі не сумаваў Хіцер.
На пачатку ледзь не філолагам стаў Зміцер:
Розныя словы ўзяўся вучыць Хіцер.
«Дэфіцыт», «даць у лапу», «грэць рукі»,—
шаптаў Зміцер,
«З-пад палы», «блат», «шыта-крыта»,—
— паўтараў Хіцер.
Назубок зазубрыў словы магічныя Зміцер
І ў ход пачаў памаленьку пускаць іх Хіцер.
Пусціць адно —
«Гарызонт» у кватэры пакручвае Зміцер,
Пусціць другое —
дываном заморскім хваліцца Хіцер,
Трэцяе пусціць —
жонцы футру, як казну, дарує Зміцер,
Чацвёртае — п'е каньякі, ікрой заядаючы, Хіцер.
Не з зарплаты — са слоў гэтых простых
дачу хутка ўзнёс да нябёс Зміцер,
Потым з іх жа, звычайных тых слоў,
«Волгу», як ляльку, «зварганіў» Хіцер...
Кажуць, недзе жыве і па сёння,
спяваючы песенькі, Зміцер
Па прозвішчу Хіцер.

## Качкі

Вось так жыццё ўсё:
ходзяць па двары ўраскачку
І знаць ні пра што не хочуць
ляныя, тлустыя качкі.
Адна ў іх ідэя:
як
Набіць валляк.

## На пенсію

Такі закон жыцця ўжо ёсць:
Ледзь прыйдзе старасць, нібы госць,
Табе ўжо ў плечы весела
Лакцем штурхае маладосць:
На пенсію! На пенсію!

І мы, былыя дзеячы,
З абжытых месц устаючы,
Са скрыпам хто, хто з песняю —
Здаём другім свае ключы —
На пенсію! На пенсію!

І мроіцца нам ціхі рай:
Гурочкі сей, грыбкі збірай,
Навуджвай рыбку прэсную
Альбо ад суму памірай —
На пенсію! На пенсію!

Чуў свет, як выступаў спявак,
Быў ён цудоўнейшы мастак,
Ды час прыйшоў, і спеўся ён.
Што ж, адпачні, браток, раз так —
На пенсію! На пенсію!

А гэты Заг так крэсла ўгрэў,
Так да яго ён прыкарэў,
Так ля яго раз'еўся ён,
Што — не пытай — хутчэй памрэ,

Чым пойдзе сам на пенсію!

Яму, такому таўсцяку,
Што толькі спіць у халадку,
Гукнём: зарос ты плесняю!
Аддай стырно маладняку —
На пенсію! На пенсію!

Амаладжаецца жыццё,
Нібы на дрэве тым лісцё!

**Аб «добрай» маці
і няўдалым дзіцяці**

Сын як сын спачатку быў:
Мілы, круглы, жвавы.
Малако праз соску піў
Ды крычаў на славу.

Рос, і маці праз хлапца
Нават сну не знала:
Пхала сыну без канца
Піражкі ды сала.

— Еш, сынок, каштуй, смакуй...
— Выпі на, мой коцік...
— Можа, хочаш кісяльку?
— Мо падаць кампоцік?

Лез Мікола у пясок,
Дол капаў лапаткай.
Маці:
— Божа! Кінь, сынок,
Кінь яе, дзіцятка!

Ну, хіба ж майму сынку
Ды займацца гэтым?
Будзеш некалі ў мяне
Ты інтэлігентам!

Землякопам жа?

Ого!
Трактарыстам?
Што ты!
Ці ж для розуму твайго
Чорная работа?

На гарачых піражках,
Перніках без ліку
Вырастаў як на дражджах
З Мікалайкі — Міка.

Па двары ганяць футбол
Толькі ён і ведаў.
Забіваў часамі гол...
У вакно суседу.

А ледзь ён за малаток
Ці сякеру браўся,
Маці зноўку:
— Кінь, сынок,
Лепш з мячом бы знаўся!

Ну, хіба ж майму сынку
Ды займацца гэтым?
Будзеш некалі ў мяне
Ты інтэлігентам!

Сталяварам жа?
Ого!
Цесляром?
Ды што ты!
Ці ж для розуму твайго
Чорная работа?

Скончыў Міка школу тут,
Кніжкі ў кут закінуў:
— Што ж ты, маці? У інстытут
Уладкоўвай сына!..

Толькі справы дрэнь былі
У «інтэлігента»:
Як ні лез, не прынялі
Міку у студэнты.

Бедавала маці год,
У слязах была ўся.
— Мо, сынок, хоць на завод
Ты цяпер падаўся б?

— Як?! Быць токарам?
О не!
Цесляром?
Ды што ты!
Хіба ж гэта для мяне
Чорная работа!

Адтапырана губа,
Каля шыі — банцік.
Крочыць ён шукаць забаў,
Рэстаранны францік.

А работа?
Напляваць!
Пыл там, дым — страшэнна!
Лепшён будзе зарабляць...
Ля чужых кішэняў.

Так і споўдаўся, як цень,
Каля цёмных вуліц,
Ды аднойчы за каршэнь
Узялі «чысцюлю».

Ну, а маці?
Цэлы дзень
Валасы рве, енчыць:
Хто, скажыце, людцы, й дзе
Мне дзіця скалечыў?..

**Замачылі**

Купіў сабе касцюм Савось.
Лаўсанавы, чын чынам.
Прыбраўся ў новае і вось
Шыбуе ў парк хлапчына.

Ды тут насустрач дружбакі.
Няўжо Савось, ну й лоўка.
Віншуюць хлопца ў дзве рукі:
— З абноўкай, брат, з абноўкай!

Хадзем замочым — важны ж факт!
Як? Без замочкі пойдзеш?
Дык ён рассохнецца ж,
А так
Не зносіш за стагоддзе!

Над круглым столікам «Зары» —
Насы як памідоры.
П'юць, не шкадуючы, сябры
За Саўкавы уборы.

Ноч, а яны ў «Зары» яшчэ:
— Падбавім мо?
— Падбавім!
І ў шклянкі зноў цячэ й цячэ
Гарэлка для забавы.

Бязлюдна ўсюды. Ціха скрозь.

Ды вось у змроку мутным
Ідзе зігзагамі Савось —
За сем кварталаў чутна.

Ідзе, і ўжо сваіх двух ног
Тут малавата хлопцу.
Савось на ўсіх на чатырох
Гразь па завулках топча.

Назаўтра ўстаў і аж абмяк:
Штаны — хоць ты выкручвай,
А там, дзе кінуў ён пінжак,
Ляжаць адны анучы.

З адчаем Саўка ў грудзі б'е,
Глядзіць на ўборы слёзна.
Кляне сяброў, кляне сябе,
Ды толькі вельмі позна!

**Хаця б чаго не выйшла**

Жыў ціха Стах, не меў заўваг.
Зайздросцілі ўсе Стаху.
Ды толькі быў надзелен Стах
Залішняй дозай страху.

Не бачыў ён ні зорак-воч,
Ні ў белай пене вішань.
Адно тачыла дзень і ноч:
Хаця б чаго не выйшла!

Выходзіць з дому ў горад Стах,
І мроіцца ўжо Стаху:
Вось на яго — трах-тарарах! —
Наехаў МАЗ з размаху.

А пераход — перш чым ступіць,
Паўдня ў якім зацішшы
Ён, трасучыся, прастаіць:
Хаця б чаго не выйшла!

Да жонкі прыйдзе: легчы б як
Хацеў ён пры каленях.
А што як вырасце сям'я
Ад гэтага хацення?

О не! Хоць жонку і люблю,
Ды дзеці ж — вэрхал лішні.
Лепш дзе пад плотам перасплю:

Хаця б чаго не выйшла!

Для драмгуртка аднойчы Стах
Стварыў знянацку драму.
Ды што як будзе яна — жах! —
Не даспадобы Саму?

Мо перагнуў? Ці не дагнуў?
І, каб не думаць лішне,
Аддаў ён свой жа твор агню:
Хаця б чаго не выйшла!

Пра той яго ідэйны гарт
Дайшла да клуба чутка.
— Ну, што ж,— сказаў загадчык,— варт!
І меў ён крэсла хутка.

Стаў сам камандаваць гуртком,
Ды, пост свой уявіўшы,
Закалаціўся ўсім нутром:
Хаця б чаго не выйшла!

Прыносяць п'есу — будзь здароў!
Не твор, даводзяць,— глыба!
Зладзеяў, лежняў, махляроў,
Як трэба, б'е па хібу.

Ну, ну, а што, калі й па мне
Той глыбай найвялікшай?
Адразу візу тут? О не!
Хаця б чаго не выйшла!

Ім візу даць? А што, як тхор
Які зарыт тут? Візу!
Ён месяц з лупай гэты твор
Разглядваў — зверху, знізу.

І вось здалося: твор запах,
І праўда, псінай згніўшай.
О, пахаваў яго тут Стах:
Хаця б чаго не выйшла!

Ды тут сказалі Стаху: брат,
Дзе ж ежа для тэатра?
Гарыць аматарскі тэатр!
Куды ж такое варта!

Збялеў наш Стах: і як тут быць?
Мо ён на свеце лішні?
Вяроўку ўзяць? Ці далей жыць?
Хаця б чаго не выйшла!

## Ахвяра букваедства

Як людзі, жыў Антось, ды вось
Пачуў параду ў свеце:
— Глядзі, ніколі не вынось
З уласнай хаты смецце.

Прывык Антось любіць статут,
Жыў нават па раскладу.
Таму пачаў адразу тут
Ажыццяўляць параду.

Усё у хаце ён цяпер
Захоўваў да смяцінкі —
Атопкі, друз, цюкі папер,
Рыззё, шмаццё, скарынкі.

Да столі вырасла гара
Ў Антося таго смецця.
Тут схамянуўся ён: пара
Яго хаця б адмесці!

Ды позна: да дзвярэй бядак
Прабрацца ўжо не мог ніяк.
І каб праход сабе прыбраць,
Пачаў ён смецце ушчыльняць.

Ахапкамі старых газет
Даверху забіваў клазет,
А дробныя газеткі
Запіхваў у разеткі.
Так кідаўся ўвесь дзень, ды — гора
Не меншаліся смецця горы.

Пад вечар, мокры да штаноў,
Упаў Антось без сілы.
Яго гарою рызманоў
У момант прыдавіла.

Брыгадай нейкаю праз дзень
Антось быў адкапаны.
Хто быў там, кожны шапку здзеў:
Памёр ён гэтак рана!

Ды як настаўніку свайму
Прыхільнікі гурбою
Да неба манумент яму
Узнеслі, як герою.

І іх навостраны тапор
На гэтым мануменце,
Каб зналі, выбіў так: «Памёр,
Але не вынес смецця!»

**Ода одам**

Не заводам,
Не параходам,
Не гарадам,
Не гародам —
Складаю я оду
Одам.
Якія ў іх стройныя строфы!
Якія ў іх трапныя тропы!
Як лоўка яны пад цябе падплываюць,
стругі!
Як вытанчана перабіраюць
душы тваёй струны!
Як дух узвышаюць заўсёды!
О оды!
Оды сталіцам,
Оды дварам,
Оды феліцам,
Оды царам.
Быў цар — чалавек.
Былі і ў яго хібы.
Як і ўсіх, браў яго одум.
Ды вось аддалі цара
одам.
Слоў агняцветных рэкамі,
марамі алею і мёду
Затапілі цара оды.
О як умелі хвалу пець оды!
Галаве — оды,
звілінам розным яе — оды,
вачам, якім за трыста гадоў наперад відаць,—
оды,
Рукам, якім дадзена сонца наўкруг рассяваць,—
оды,
брывам — оды,
вусам — оды,
вушам — оды...
Так услаўлялі оды цара,
так узвышалі,
так малявалі,
Аж пазнікалі ў яго ўсе барадаўкі, шрамы,
Вуглаватасці і радзімыя плямы,
Пайшло расці тулава ў неба,
у шырыню — плечы,
Запоўніўся лоб.
мудрасцю нечалавечай...
Вось так з чалавека —
ні мала, ні многа —
Оды рабілі
бога.
Шумелі оды,
Шалелі оды,
Ды на зямлю ўжо даўно прыляцелі
Інакшыя годы.
Ходзяць, скісшы,
Одапісцы:
Няма ўжо моды
На оды.
Няма і не будзе.
Хай людзьмі застаюцца людзі!

* * *

Ты пакрывіў душой —
сказаў не тое, што думаў:
Меркаваў, што ілжывае слова тваё —
толькі кропля маленькая ў моры зла.
А што калі кожны гэтак жа сама,
змаладушнічаўшы,
пакрывіць хоць раз у жыцці душой?
З маленькіх кропелек гэтых
утворыцца новае мора,
якое — на колькі яшчэ стагоддзяў? —
Перакрые дарогу
да праўды.

**Гузік**

Хваліўся гузік ганарыста ўсім,
Што цэлы свет
трымаецца на ім адным.
А аказалася
(о гузік, гузік, як жыццё пражыў ён!),
Трымаў ён
усяго штаны чужыя!

* * *

На дом дзівак
Наводзіць лак,
І — прыгажэе асабняк.
Каму відно, што ўдзень і ўночы
Яго пад лакам шашаль точыць!

**Крот**

Увесь свой век — у цемры крот,
Грабе зямлю — ад году ў год.
Не знае крот, што над зямлёю
Сонца ходзіць залатое!

* * *

Жыццё адно. А мы — на чаркі, сваркі,
На модны гарнітур, на гальштук яркі,
На рэбус, на чарпак, на карамель
Разменьваем яго,
нібы рубель.

# Я прыйшоў да вас...

**У адбудаваным Мінску**

Каханая, хутчэй
Ідзём да плошчы блізкай:
Не бачыў я яшчэ
Такім, як сёння, Мінска.

Зірні, як вецярок
Над роўным строем ліпаў
З прысад, нібы знарок,
Пялёсткаў рой рассыпаў.

Калі, не знаю сам,
Бяру цябе пад руку,
Як легка крочыць нам
Па вычышчаным бруку.

Агнёў, глянь, колькі хтось
Навешаў над праспектам.
Аж ззяе ўсімі скрозь
Ён колерамі спектра.

Які разгон — жыві!
Усмешак — горад поўны.
Ці ж быў бы без любві
Наш Мінск такім чароўным?

* * *

Калі каханне, як світанне,
Цябе пакліча на спатканне,
Ідзі насустрач, не туліся
За частаколам, у цяні:
Раз ты баішся апячыся —
Зусім не грэйся пры агні.

* * *

Скрозь вуліц і двароў хітраспляценні
Давай збяжым з табою на цямку
Туды, дзе танканогія алені
Пужліва п'юць азёры з лазняку,

Дзе вецер — за лістком лісток — гартае,
Як кнігу, крону белую вярбы
І голас свой прарэзлівы, гартанны
Бяруць у рыжым хмызе журавы...

З пастоў здымае раніца туманы
І сонцам адчыняе далячынь.
Хутчэй абмый расою твар заспаны,
Бяжым, бяжым — у дарагую сінь!

Хай голле лоз зялёных б'е па твары,
Дубцамі елак колкіх хвошча — што ж!
У дальняй далі, пад грамоў удары —
Не плач пра плашч — нас прапалошча дождж.

О ясны май, зялёны і люстраны!
О сполахі высокія камет!
Ці ж рамкай вузенькай телеэкрана
Для нас сышоўся неабдымны свет?

Нам трэба спеў прастораў чуць заўсёды,
Пад вольным небам бачыць — не ў кіно —
Рачулак паясы і сонца ўсходы,
Маланак пугі і лугоў радно.

Карціны лепшай не знайсці за тую,
Што на самой зямлі вясна няўзнак
Вясёлкавымі фарбамі малюе.
Які зраўняцца можа з ёй мастак?

Туды, дзе ў дрэвах ходзяць светацені,
Дзе не змаўкае вечнае ку-ку,
Давай збяжым з табою на цямку
Скрозь вуліц і двароў хітраспляценні.

* * *

Не шкадуйце добрых слоў жанчыне.
Стрэўшыся,
кажыце ёй часцей
Аб яе красе,
аб дабраце,
Аб вачах яе,
чароўных, сініх.
З ружай параўноўвайце,
з вяргіняй —
І яна,
як кветка,
расцвіце!

* * *

Ты скажы — я адразу пайду
За цябе у агонь і ў ваду.
Я гатоў нават горы скрануць,
І мароз і спёку сцярпець —
Толькі б голас твой мілы чуць,
Толькі ў вочы б твае глядзець.
Што ні скажаш, усё зраблю —
Ты пабачыш, як я люблю;
За цябе ўсё аддам — загадай.
Аднаго не змагу, выбачай:
Прамяняць на цябе свой край.

* * *

Не ідзі дахаты, пасядзі,
Паглядзі, якая ў небе ноч
І якія зоры, паглядзі,
На расянай руцэ каля ног!

І якія ліпы і сасна!
І які унь месяц на вярбе!
І якія ружы — бо вясна —
Расцвілі у сэрцы для цябе!

* * *

Я цябе, як песню, любіў,
Хмель круты тваіх вуснаў піў,
Да высокай зары над зямлёй
Я цебе ад верб не пусціў.

Думаў, вып'ю цябе да дна
У шырокіх, дужых руках,
Але ты для мяне была
Невычэрпная, як рака.

Зноў ішоў да цябе праз ноч,
Праз мяцеліцы, праз агні,
Да тваіх спагадлівых воч
І жаночай гарачыні.

Я цябе, як песню, любіў,
Хмель круты тваіх вуснаў піў
І да скону, відаць, табой
Галаву захмяліў.

* * *

Былі тады — ноч,
ты ў слабенькім паркаліку,
арэшнік,
Ды я, грэшнік.
А зоркі ўсе стаялі, як адна,
У возеры расчыненым, без дна.
А ў беразе праз сон (ці ад савіных лап?)
з адчаем
Крычала
чайка.
І вабна слалася нам да сцяжыны
Квяцістаю пярынай —
канюшына.
І ў шчасця свет вяла (так блізка блузка!)
Конікаў
язычаская музыка.

* * *

Ты мне казала:
— Без цябе дайду дадому, адыдзі!
А вочы гаварылі:
— Правядзі...
Ты мне казала:
— Ну! Без рук! Пусці хутчэй!
А твае рукі:
— Прыгарні яшчэ!
Ты мне казала:
— Не цалуй мяне, благі!
А губы зноў шапталі:
— Дарагі...
Ты мне казала:
— Што ты! Нельга! Цвёрда кажу я!
А сэрца стукала:
— Твая, твая...
І добра ўсё ж,
што ў часе залатым
Паверыў я
зусім не словам тым,
А твайму сэрцу,
трапяткім губам,
Рукам гарачым,
маладым вачам!

**Я прыйшоў да вас**

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што за горадам ноч, як дзень:
Каля рэчак вербы не спяць,
Ясны месяц стаіць у вадзе.

Там, пры сцежцы, ажыны цвітуць,
Май шугае праз берагі.
Там дзве пары слядоў вядуць
У някошаныя мурагі.

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што не раз можна ў свеце кахаць:
Гэта ўсё хлусня, ўсё мана,
Што любоў на зямлі адна.

Хай замерла зямля, як струна,
Хай замоўкла ў палоне сноў,
Цёплым крыллем махне вясна —
Расцвітаюць яблыні зноў.

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што няма на зямлі небыцця:
Будзе вечна пад сонцам граць
Залатое кола жыцця.

Як заманліва ўсё наўкол!
Правады на слупах гудуць.
Недзе рэжа сінь ледакол,
Электрычкі па свеце бягуць.

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што для нас гэта зоры гараць,
Што не згасне ў крыві маладосць
І што шчасце на свеце ёсць!

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

**Змест**

I. Я З ТОЙ КРАІНЫ

Я з той краіны
* * * Мае землякі
Маім землякам
Першы крык
* * * За Стоўбцамі, дзе, як паданне, ноч...
Даяркі
* * * Народ мой — высокае дрэва шматлістае
Балада пра Хатынь
Хадыка
Песня партызана
* * * Як анямеўшы, стаялі тады мы
Вучыцца ў Леніна нам трэба
Герцан
«Гапон» В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінскай кнігарні, 1855 год
Каліноўскі — апошняе слова
Бацькаўшчына
З календара хлебароба
Дзядзька Адам
* * * Мова зямлі маёй!
* * * А дзень, як гарбуз паласаты
* * * А ўсё ж я рад, што ў гэты свет
Завуць касманаўтаў планеты
* * * Калі б не свяціла сонца
Санцаход
* * * Зноў вярнуўся я ў бацкаў свет палявы
* * * Вось ізноў праз безліч гадоў
Сцежкі маленства
Перакаці-поле
Мурашка
Жураўліныя ягады
* * * Замятае, лісцем замятае
* * * Так кожнаму наканавала
Закон вады
* * * У мяне ёсць мара глыбінная

II. ВЫРАЙ

* * * Далека ад азяродаў
* * * Жыў хлопец. Мастак. І былі ў яго скарбы...
Лісце
Зярняты
* * * Не веру я, што ў нейкі век
* * * Чалавек — бог
* * * Аднекуль з-пад воблачка
* * * Усё паўтараецца з веку ў век
* * * Ліст легкакрылай чайкай
* * * Бываем мы часам
* * * Жыццё пражыць
Саксаул
* * * Мы б'ёмся над рыфмай
* * * Мы ў гэты свет

III. ХІЦЕР-ЗМІЦЕР

Маўчанне

* * * Мая хата з краю
Хіцер-Зміцер
Качкі
На пенсію
Аб «добрай» маці і няўдалым дзіцяці
Замачылі
Хаця б чаго не выйшла
Ахвяра букваедства
Ода одам
Ты пакрывіў душой
Гузік
* * * На дом дзівак
Крот
* * * Жыццё адно

IV. Я ПРЫЙШОЎ ДА ВАС

У адбудаваным Мінску
* * * Калі каханне, як світанне
* * * Скрозь вуліц і двароў хітраспляценні
* * * Не шкадуйце добрых слоў жанчыне...
* * * Ты скажы—я адразу пайду
* * * Не ідзі дахаты, пасядзі
* * * Я цябе, як песню, любіў
* * * Былі тады — ноч, ты
* * * Ты мне казала
Я прыйшоў да вас

Цвірка К.

Каласы. Вершы. Мн., «Маст. літ.», 1975.- 128 с. з іл.

Думка пра родную зямлю, пра чалавека працы праходзіць праз усю кнігу К. Цвіркі. Піша ён проста і зразумела. Строфы яго, вобразна гаворачы, падобны да барозен, што сцелюцца далёка-далёка ў сонечныя гарызонты.

На белорусском языке
Константин Александрович Цвирка
КОЛОСЬЯ
Рэдактар Хв. М. Чэрня. Мастак Ул. У. Даўгань. Мастацкі рэдактар М- Р. Казлоў. Тэхнічныя рэдактары С. А. Абрамчук, М. Ц. Папкова. Карэктар Я. Ф. Харко.
АТ 04208. Здадзена ў набор 5/VIII 1974 г. Падп. да друку 9/XII 1974 г. Тыраж 500О экз. Фармат 70Х100'/з2. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 5,16. Ул.-выд. арк. 3,61. Зак. 1146. Цана 37 кап.
Выдавецтва <Мастацкая літаратура»
Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Савецкая, 19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Мінск, Ленінскі праспект, 79.